# Прафілактычная акцыя “Забяспечым дзецям бяспеку!”праводзіцца з 21 сакавіка па 8 красавіка 2022 года на тэрыторыі Гомельскага раёна

У 2021 годзе на тэрыторыі Гомельскага раёна дзеці ва ўзросце да 16 гадоў сталі ўдзельнікамі 2 ДТЗ, у якіх 2 атрымалі раненні. Сярод дзяцей, якія атрымалі ў ДТЗ траўмы, 1 веласіпедыст, 1-пасажыр, паведамляе намеснік начальніка АУС Гомельскага райвыканкама падпалкоўнік міліцыі Васіль Пінчук.

Для прыцягнення грамадскасці да праблемы дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму Дзяржаўтаінспекцыя праводзіць з 21 сакавіка па 08 красавіка 2022 года на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прафілактычную акцыю па папярэджанні дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам непаўналетніх «забяспечым дзецям бяспеку!”, падчас якой супрацоўнікі правядуць вялікую інфармацыйна-прапагандысцкую працу сярод насельніцтва па прафілактыцы дзіцячага траўматызму на дарогах, па растлумачэнні змяненняў і дапаўненняў у Правілы дарожнага руху ў частцы перавозкі дзяцей сярод кіроўцаў індывідуальнага транспарту, а таксама правілаў перавозкі арганізаваных груп дзяцей аўтобусамі сярод перавозчыкаў і арганізатараў перавозкі. З боку супрацоўнікаў ДАІ будзе ўзмоцнены кантроль за спыненнем парушэнняў правілаў дарожнага руху кіроўцамі, дзецьмі і бацькамі з дзецьмі.

“Забяспечым дзецям бяспеку!”- гэтую ісціну вельмі часта ставяць па сумневы дарослыя ўдзельнікі дарожнага руху. Ці заўсёды бацькі, якія знаходзіліся ў момант трагедыі побач,

прымалі ўсе залежныя ад іх меры, каб засцерагчы сваіх дзяцей і не дапусціць дарожна-транспартнага здарэння?

— Паважаныя бацькі, пры перасячэнні праезнай часткі са сваім дзіцем вазьміце яго за руку, па магчымасці выпраўляйце дзяцей да школы, а таксама Сустракайце з яе. Таксама паклапаціцеся, каб на вопратцы, заплечніку ці партфелі дзіцяці ў цёмны час сутак быў святлоадбівальны элемент — — адзначае Васіль Пінчук.

Таксама ён нагадаў аб правілах перавозкі дзяцей у легкавым аўтамабілі, абсталяваным рамянямі бяспекі:

— Ва ўзросце да пяці гадоў перавозка павінна ажыццяўляцца з выкарыстаннем дзіцячых утрымліваючых прылад, якія адпавядаюць вазе і росту дзіцяці. Ва ўзросце ад пяці да дванаццаці гадоў — дзіцячых утрымліваючых прылад, якія адпавядаюць вазе і росту дзіцяці, іншых сродкаў (бустэраў, спецыяльных падушак для сядзення, дадатковых сядзенняў), якія дазваляюць бяспечна прышпіліць дзіця з дапамогай рамянёў бяспекі, прадугледжаных канструкцыяй транспартнага сродку.

Гэтак жа ўводзіцца забарона на перавозку дзяцей да дванаццаці гадоў на заднім сядзенні матацыкла, мапеда.

Мы нясем адказнасць за ўсіх дзяцей, незалежна ад ступені сваяцтва, і павінны аб’яднаць намаганні, каб з зводак дарожна-транспартных здарэнняў зніклі дзеці, а паводзіны дарослых на дарозе павінна стаць для непаўналетніх прыкладам для пераймання. Задумайцеся над ім ужо сёння-і вы прадухіліце гібель дзяцей на дарогах заўтра!



https://sozhnews.by